# АЛГАРЫТМЫ ПРАЦЫ З ВУЧЭБНЫМ ТЭКСТАМ НА ЗАНЯТКАХ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ НА ФАКУЛЬТЭЦЕ ДАВУЗАЎСКАЙ ПАДРЫХТОЎКІ

*Невядомская В.В.*
*Віцебск, ВДМУ*

Як вядома, значны ўплыў на пазнавальную дзейнасць вучняў робяць практыкаарыентаваныя тэхналогіі. Пры гэтым забяспечваюцца якасць, выбіральнасць вучэбнага матэрыялу, улік індывідуальнасці, своечасовы кантроль і самакантроль засваяльнасці. Акрамя таго, такія тэхналогіі даюць магчымасць індывідуалізацыі вучэбнага працэсу праз яго дыферэнцыяцыю. А гэта вельмі прадуктыўна ў арганізацыі групавых заняткаў пры падрыхтоўцы да цэнтралізаванага тэсціравання (ЦТ) па беларускай мове на факультэце давузаўскай падрыхтоўкі (ФДП).

На практыцы выкладчык усё часцей сутыкаецца з тым, што навучэнец, які прыйшоў на заняткі з мэтай актуалізаваць і сістэматызаваць свае веды (а ў некаторых выпадках і спазнаць тое, што было зусім не засвоена ў курсе беларускай мовы ў школе), не можа спасцігнуць і творча перапрацаваць вучэбны тэкст.

У сучасных умовах адукацыйнага працэсу не прыходзіцца спадзявацца на тое, што вучань здолее самастойна вызначыць зместавыя апоры вучэбнага тэксту. Лічым, што менавіта адсутнасць алгарытмаў і ўзораў як сістэмы вучэбных аперацый з тэкстам вельмі негатыўна адбіваецца на ўзроўні падрыхтоўкі вучняў да здачы цэнтралізаванага тэсціравання па любой дысцыпліне.

Пад тэрмінам «алгарытм» разумеем паслядоўнасць выканання вучэбных дзеянняў, структуру гэтага працэсу дзеянняў. На сённяшні дзень актуальнай задачай методыкі з'яўляецца распрацоўка алгарытмаў, тэхналогій, выбар найбольш актуальных формаў, якія забяспечваюць прадуктыўную пазнавальную працу вучняў.

Мэта нашага даследавання – вызначыць алгарытмы паспяховай працы над вучэбным тэкстам у рэчышчы камунікатыўна-пазнавальнага працэсу на занятках па беларускай мове на ФДП.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам паслужылі вучэбныя тэксты ў дапаможніках па беларускай мове, прызначаных для падрыхтоўкі абітурыентаў да цэнтралізаванага тэсціравання, праведзены іх аналіз.

**Вынікі даследавання і іх абмеркаванне.** У сучаснай метадалогіі выкладання нярэдка недаацэньваецца роля практычных метадаў дзейнасці над вучэбным тэкстам, звычайна форма працы з вучэбным тэкстам лічыцца настолькі традыцыйнай і асвоенай, што ёй не надаецца дастатковай увагі. З гэтай прычыны алгарытмы і іншыя ўзоры працы над вучэбным тэкстам разглядаюцца намі найперш як сукупнасць дзеянняў, скіраваных на

спасціжэнне сэнсавай структуры вучэбнага тэксту. Безумоўна, эфектыўнасць выкарыстання алгарытмаў залежыць ад таго, як у вучняў сфарміраваны ўменні асэнсаваць і зразумець тэкст.

Таксама адзначым і тое, што сутнасць прапанаванай сістэмы працы над вучэбным тэкстам скіравана не на механічнае запамінанне або ўзнаўленне тэксту, а на выяўленне і ўсвядомлены аналіз яго сутнасных характарыстык.

На нашу думку, у гэтым накірунку будуць найбольш перспектыўнымі такія віды працы, як ключавыя словы і паняцці, якія раскрываюць сэнсавую структуру тэксту; пытанні як першапачатковая ступенька камунікатыўна-пазнавальнай дзейнасці; план тэксту як падзел на семантычна значымыя часткі; кластар, які дазваляе зрабіць зрокавым працэс засваення вучэбнага тэксту; табліца як вынік класіфікацыі сэнсавай структуры тэксту; канспект як сродак класіфікацыі і ўсведамлення сутнасці вучэбнага тэксту.

Акрамя таго, такая сістэма працы дапаможа і ў далейшым адукацыйным працэсе ва ўніверсітэце, якую б спецыяльнасць не абраў сабе абітурыент.

Ключавыя паняцці – гэта невялікая колькасць слоў, якія складаюць сутнасць вучэбнага тэксту па пэўнай тэме. З нашага вопыту, даволі паспяховым з’яўляецца навучальная дзейнасць, калі абітурыент ужо мае пералік ключавых паняццяў і запісвае азначэнне гэтых паняццяў з вучэбнага тэксту на занятках або падчас падрыхтоўкі тэмы. Карысна прапанаваць вучням скласці ўласны тэкст, абапіраючыся на ключавыя паняцці.

Кластар графічна адлюстроўвае інфармацыйнае поле вучэбнага тэксту. Па сутнасці, методыка кластара заключаецца ў наступнай паслядоўнасці: па сярэдзіне ліста паперы запісваецца ключавое слова тэксту; вакол фарміруюцца словы, якія з’яўляюцца ключавымі для дадзенай тэмы; гэта структура дапаўняецца ключавымі паняццямі і лагічнымі ланцужкамі.

Напрыклад, *граматычныя катэгорыі назоўніка – род* (жаночы, ніякі, мужчынскі, агульны) *– жаночы род* (канчаткі –а, -я; нулявы канчатак; маці). Гэта прыклад невялікай часткі кластара «Род назоўнікаў». У выніку атрымліваецца структура, якую можна пабудаваць як з навучэнцамі падчас заняткаў, так і даць магчымасць ім скласці кластар дома, выкарыстоўваючы загадзя падрыхтаваныя ключавыя словы тэмы.

Не сакрэт, што любое сфармуляванае вучнем пытанне або сумненне – сігнал таго, што вучань прыступіў да асэнсавання інфармацыі. Услед за Л.С. Васюковіч, прапануем алгарытм вызначэння тэмы праз тэкставае поле (тэматычныя групы) - апорны тэрмін (слова або словазлучэнне), намінатыўны ланцужок (тоесныя намінацыі, адэкватныя ключавому тэрміну) [1, 85].

Напрыклад, па тэме «Назоўнік як часціна мовы» прапануецца выпісаць намінатыўны тэматычны ланцужок з апорным тэрмінам *назоўнік*: *часціна мовы, назвы прадметаў, назвы жывых істот, назвы геаграфічных аб’ектаў* і г.д.; атрыбутыўныя словазлучэнні з апорнай адзінкай *назоўнік*: *лексічнае значэнне,*

*граматычнае значэнне, асноўныя прыметы*; прэдыкатыўныя словазлучэнні*: назоўнік характарызуе, назоўнік абазначае, назоўнік выражае* і г.д.

На аснове гэтых тэрміналагічных ланцужкоў пры дапамозе пытанняў выкладчыка выбудоўваецца іерархія састаўных частак тэксту і разгорнуты адказ па тэме.

Спосаб структуравання вучэбнага тэксту ў табліцу і на сённяшні дзень застаецца адным з самых прадуктыўных спосабаў засваення матэрыялу. Табліцы, на наш погляд, даволі паспяхова матывуюць на крытычнае даследаванне вучэбнага тэксту. Напрыклад, запаўненне пропускаў ва ўжо створанай табліцы, апісанне логікі пабудовы табліцы, стварэнне табліцы па ўзору і г.д.

У навуковай літаратуры адзначаецца недастатковасць сістэмнай працы і спарадычны характар працы ў школе над ранжыраваннем інфармацыі вучэбнага тэксту. Але ўнікненне ад выпрацоўкі алгарытму складання плану не накіроўвае вучняў на свядомы, а не інтуітыўны шлях засваення вучэбнага тэксту. Таму на занятках па актуалізацыі і сістэматызацыі моўнага матэрыялу імкнёмся да таго, каб навучэнец мог усвядомлена патлумачыць, разгарнуць змест тэмы – вылучыць асноўную думку кожнай мікратэмы, падзяліць тэкст на логіка-сэнсавыя часткі, сфарміраваць пункты плана.

Як вядома, уменне канспектаваць вучэбны тэкст накіравана на ўменне асэнсоўваць і аналізаваць. На наш пункт погляду, найбольш карыснымі для паспяховага засваення вучэбнага матэрыялу з'яўляюцца наступныя формы канспектавання: канспект у форме разгорнутага плана (з іерархіяй і падіерархіяй пунктаў), пабудова кластараў (схем), табліц, апорных сігналаў і абазначэнняў. Неабходна паказаць навучэнцу, як закадзіраваць змест вучэбнага тэксту з дапамогай пэўных абазначэнняў. Гэта работа можа быць вельмі прадуктыўнай падчас сістэматызацыі вучэбнага матэрыялу, на які адводзіцца па тэматычнаму плану для слухачоў дзённага аддзялення ФДП 45 вучэбных гадзін.

**Заключэнне.** Такім чынам, у сувязі з акрэсленымі ўмовамі прад'яўлення навукова-вучэбнай інфармацыі важна даследаваць і распрацоўваць стратэгію працы з навучальнымі (вучэбнымі) тэкстамі, што, у сваю чаргу, будзе знаходзіць адлюстраванне ў структуры навучання беларускай мове на ФДП і будзе мець вынікам паспяховую здачу ўступнага экзамену ў ВНУ. Распрацоўка і выпрацоўка алгарытмаў працы з вучэбным тэкстам забяспечыць не толькі прадуктыўную пазнавальную дзейнасць слухачоў падчас аўдыторных і самастойных заняткаў, але будзе «мосцікам пераемнасці» навучання ў школе і ўніверсітэце.

## Спіс літаратуры

1. Васюковіч Л.С. Навуковы тэкст як кампанент школьнага падручніка па беларускай мове: Манаграфія / Л.С. Васюковіч. – Віцебск: Выдавецтва УА "ВДУ імя П.М. Машэрава", 2003. – 150 с.